*А. У. Бервячонак*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)*

## СКРЫГАЛАЎ – ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ АБ'ЕКТ АНАМАСТЫКІ І ТУРЫЗМУ МАЗЫРШЧЫНЫ

Сляды мінулых эпох (рэвалюцый, войнаў, нашэсцяў многіх заваёўнікаў, зменаў палітычных фармацый, розных прыродных, тэхнагенных катастроф) закранулі не толькі буйныя населеныя пункты, але і малыя геаграфічныя пасяленні: пасёлкі, вёскі, мястэчкі, хутары, іншыя лінгвакультуралагічныя аб'екты.

Сярод паселішчаў Мазыршчыны ёсць нямала такіх вёсак, пасёлкаў, уцалелых хутароў, якія зацікавяць турыстаў сваёй гістарычнай спадчынай, самабытнай культурай, рэдкай дабрачыннасцю, талерантнасцю мясцовых жыхароў.

Прыкладам у гэтых адносінах можа служыць і вёска Скрыгалаў, якая знаходзіцца за 33 кіламетры ад раённага цэнтра горада Мазыра. Мясцовы даследчык-краязнавец М. Капач адзначае, што "Скрыгалаў належыць да ліку найбольш старажытных пасяленняў Мазырскага раёна, магчыма, ён равеснік Мазыра (1155 г.) ці нават старэйшы за яго. Маецца некалькі сведчанняў у гістарычных дакументах пра мястэчка Скрыгалаў (1240, 1387, 1435 гг.)" [1, с. 123]. Знойдзеныя археолагамі ў ваколіцах сучаснай вёскі два могільнікі X–XIII стст. сведчаць аб старажытным засяленні дрыгавічамі гэтай мясцовасці. Першыя пасяленцы звычайна выбіралі зручныя, прыдатныя мясціны для жыцця па берагах рэк, старыцаў, азёр, на астравах, сярод дрыгвяністых балот (што служыла пэўнай абаронай ад набегу суседніх плямёнаў), побач з ляснымі масівамі. Гэта давала магчымасць ім выжыць, займаючыся рыбнай лоўляй, зборам грыбоў і ягад, паляваннем, прымітыўнай апрацоўкай зямлі.

Скрыгалаў, як і іншыя населеныя пункты Мазыршчыны, перанёс цяжкія часы ліхалецця: нашэсце мангольскіх заваёўнікаў, а пазней – крымскіх татар, тэрыторыя неаднаразова падвяргалася рабаўніцтву, разбурэнню (1240, 1497 гг.) [1, с. 123]. У гэтым мястэчку быў забіты мітрапаліт Кіеўскі і ўсея Русі Макарый, у знак яго памяці і пашаны ўзведзена капліца, а ва ўрочышчы Пяцеліца – абеліск.

За доўгі гістарычны перыяд развіцця Скрыгалаву неаднаразова прыходзілася мяняць сваіх гаспадароў-уладальнікаў. З XV ст. мястэчка знаходзілася ў складзе ВКЛ, з 1569 г. – Рэчы Паспалітай, з XVI ст. лічыцца каралеўскім маёнткам, затым пераходзіць у прыватнае ўладанне Кмітаў, Дэнгофаў і інш. З XVII ст. Скрыгалаў належыць буйным магнатам-памешчыкам Аскеркам, якія клапаціліся пра развіццё гандлёвых адносін з рознымі гарадамі Рэчы Паспалітай, царскай Расіі. Пра аўтарытэт Скрыгалава як своеасаблівага культурнага і гандлёвага цэнтра (мелася царква, малітоўны дом, школа, земскае вучылішча) сведчыць правядзенне кожны год двух міжнародных кірмашоў, штотыднёвых гандляў. Пастаўлялі за межы краіны дзёгаць, лес, жывіцу, вугаль, дары лесу, розную сельскагаспадарчую прадукцыю і інш. Жыхарамі Скрыгалава былі дробныя рамеснікі, гандляры, сяляне, па нацыянальным складзе большую частку складалі яўрэі [1, с. 123-124].

Сваю гаспадарчую дзейнасць памешчыкі імкнуліся праводзіць на адпаведнай навуковай аснове: удасканальвалі прамысловыя прадпрыемствы новай тэхнікай, абсталяваннем, якое прывозілася з-за мяжы; панскія маёнткі станавіліся асяродкамі, цэтрамі высокай культуры: ствараліся паркі, скверы на еўрапейскі ўзор, будаваліся школы, адкрываліся бібліятэкі.

ГДПУ ІМ. І.П.ШАМЯКІНА

Значны час Скрыгалаў знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі – пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.).

Далейшы лёс Скрыгалава вызначалі новыя гаспадары: графіня Кацярына Ігнацьеўна, пазней – купец і лесагандляр Карл Шэпелер, затым – буйны лесагаспадар Берман-Брэгман.

З 1924 года Скрыгалаў атрымлівае статус вёскі (раней быў мястэчкам), хоць ужо даўно выразна ў ім выяўляліся гарадскія рысы: у 1909 годзе ў гэтым населеным пункце налічвалася 204 двары і 1284 жыхары; дзейнічалі лесапільны завод, паравы і два вадзяныя млыны, мелася рачная прыстань, што давала магчымасць зручнага воднага гандлю з іншымі гарадамі і замежнымі краінамі [1, с. 124-125]. Цяпер вёска Скрыгалаў лічыцца аднОЙ з прыгажэйшых мясцін Мазыршчыны, з шэрагам грамадска-культурных устаноў.

Назва вёскі Скрыгалаў, паводле меркавання В.А. Жучкевіча, паходзіць "ад прозвішчаў Скрыган, Скрыгайлаў, якія сустракаюцца надзвычай часта. Не выключана магчымасць сувязі з імем вялікага князя літоўскага Скрыгайлы" [2, с. 347].

Іншай думкі прытрымліваецца А. Рогалеў, які сцвярджае, што "геаграфічная назва Скрыгалаў утварылася ад асабовага імя Скрыгал ці, хутчэй, Скрыгала. Такое імя, як можна меркаваць, меў нейкі ўладальнік данай мясцовасці, магчыма, яшчэ ў дрыгавіцкі час" [3]. У артыкуле "Скрыгалаўскае паданне" гэты аўтар дае яшчэ адно тлумачэнне адносна назвы вёскі: "тапонім Скрыгалаў, як нам уяўляецца, неабходна лічыць больш позняй формай, якая ўзнікла пад уплывам так званай "народнай этымалогіі". Першапачатковай жа формай тапоніма, адлюстраванай ў летапісе, з'яўляецца Стрыгалоў. У першай частцы (Стры-) мы бачым тую ж каранёвую аснову, што і ў гідронімах басейна Днястра – Стрый, Стрыпа, Стрвяж, у значэнні "цячы, струменіцца; вада, якая бяжыць і струменіцца" (параўн. беларускае слова струмень "паток, струмень"). Другая яго частка адлюстроўвае слова галава ў значэнні "выток, вярхоўе ракі" [4].

Афіцыйная, агульнапрынятая назва ўжываецца як Скрыгалаў, разам з гэтым існуе і народна-гутарковы варыянт Скрыгало́ў, Скрыгало́ва.

Мясцовыя жыхары сцвярджаюць, што назва Скрыгалаў паходзіць ад скрытай (адсечанай, схаванай) галавы мітрапаліта Кіеўскага Макарыя, па іншай версіі, ад імя літоўскага князя Скрыгайла, які валодаў часткай палескіх земель.

На нашу думку, айконім Скрыгалаў мог утварыцца і ад дыялектнага тэрміна *скрыгала* – перакрыжаванне дарог, вуліц [5, с. 615]. Сапраўды, вёска Скрыгалаў знаходзілася на перакрыжаванні розных дарог: сухапутных і водных, гэта дазваляла жыхарам выгадна гандляваць са сваімі і замежнымі гарадамі, эканамічна і культурна развівацца. Тапонім Скрыгалаў таксама можа мець пэўную сувязь і з апелятывам *скрыга (крыга)* – ільдзіна на рацэ, на возеры, рыбалоўная снасць і з дзеясловам *скрыгатаць* – выдаваць рэзкі



МДПУ ім. І.П. Шамякіна

рыпучы гук, шум [6, с. 184]. Як сцвярджаюць мясцовыя жыхары, раней возера Пяцеліца (Рэчышча) было затокай ракі Прыпяць, якая зрабіла тут пятлю, і вёска Скрыгалаў была амаль акружаная вадой, магчыма, у часы вясенніх паводак ільдзіны, удараючыся і набягаючы адна на адну, стваралі гукі скрыгату. Таму найменне Скрыгалаў можа паходзіць і ад назвы ільдзіны ці рыбалоўнай прылады – *скрыга* [7, с. 738-739].

Гісторыя ўзнікнення населенага пункта, як бачым, мае розныя пункты гледжання даследчыкаў. Айкошім Скрыгалаў заканамерна мог Утварыцца ад асноў назоўнікаў *скрыгала* або *скрыга* суфіксальным спосабам (напр., Скрыгала+аў, Скрыг+ал+аў), не выключаючы і гіпотэзы А. Рогалева.

Сучасны аграгародок Скрыгалаў захаваў некаторыя сляды мінулых эпох: на тэрыторыі вёскі захаваўся Панскі парк XIX ст. і сажалка з векавымі дубамі і таполямі; каля возера Пяцеліца і па сённяшні дзень стаіць царкоўны помнік у гонар мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі Макарыя, а ў цэнтры вёскі засталіся царква і капліца святога Макарыя, маюцца таксама ў вёсцы 2 помнікі ў гонар славы загінуўшым воінам ВАВ, з сучасных аб'ектаў – вясковы Дом культуры і прадпрыемства кераміка Палесся. З прыродных помнікаў у Скрыгалаве захаваліся ўзгаданыя вышэй 2 старажытныя курганы, а таксама 2 крыніцы. Неабходна адзначыць, што кожны месяц 28 чысла традыцыйна праходзіць у Скрыгалаве ярмарка, а таксама хрэсны ход на свята мітрапаліта Кіеўскага і ўсея Русі святога Макарыя.

Такім чынам, Скрыгалаў як адзін з населеных пунктаў Мазыршчыны і па сённяшні дзень застаецца прываблівым са сваёй гісторыка-культурнай, прыродна-геаграфічнай адметнасцю, з рознымі загадкавымі паданнямі аб паходжанні назвы, з народнымі традыцыямі, шырокімі магчымасцямі сувязі з іншымі гарадамі Беларусі і бліжэйшага замежжа, з аўтамабільнымі і воднымі шляхамі, цікавымі людзьмі, якія стварылі сучасную гісторыю гэтай неардынарнай палескай мясціны, якая, думаецца, прынясе радасць адкрыцця незвычайнага любому чалавеку, які наведае яе.

**Літаратура**


1. Копач, М. Деревни и люди Мозырщины: Историко-документальная хроника Мозырского района, всех Сельских Советов и населённых пунктов региона / М. Копач. – Мозырь: КПУП "Колор", 2001. – 152 с.
2. Жучкевич, В. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск: Изд. БГУ, 1974. – 448 с.
3. Рогалеў, А. Скрыгалаў / А. Рогалеў // Камуніст Палесся. – 1990. – 19 кастрычніка.
4. Рогалев, А. Скрыгаловское предание [электронный ресурс] / А. Рогалев. – Режим доступа: http://bel-onomastika.ucoz.ru/_ld/2/208_JZT.pdf. – Дата доступа: 14.06.2013.
5. Яшкін, І.Я. Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў. Тапаграфія / І.Я. Яшкін. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 808 с.
6. Тлумачальны слоўнік беларскай мовы: у 5 т. / пад агул. рэд. К.К. Атраховіча (К. Крапіва). – Мінск: Гал. рэд. Бел СЭ, 1982. – Т. 5. – Кн. 1. – 663 с.
7. Тлумачальны слоўнік беларскай мовы: у 5 т. / пад агул. рэд. К. Атраховіча. – Мінск: Гал. рэд. Бел СЭ, 1982. – Т. 2. – 663 с.




ПУ им. И.П. Шамяки